Да
70-годдзя
Перамогі

1945-2015

**Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, увесь беларускі народ разам з брацкімі народамі узняўся на барацьбу з ворагам. Змагаліся не толькі зброяй, але і трапным сатырычным словам. Ужо на самым пачатку вайны, у ліпені 1941 года, выйшла газета-плакат «Раздавім фашысцкую гадзіну», з якой і пачалася біяграфія цяперашняга часопіса «Вожык».**






**Першы нумар газеты-плаката.**

*Пролетарии всех стран, соединяйтесь!*

# РАЗДАВИМ ФАШИСТСКУЮ ГАДИНУ

№ 1 АГИТПЛАКАТ, ИЗДАНИЕ ГАЗЕТЫ „ЗВЕЗДА" ИЮЛЬ 1941 г.

## СМЕРТЬ ФАШИЗМУ!

ВЫХОДИТ ПЕРВЫЙ ЦОМЕР НАШЕГО АГИТПЛАКАТА «РАЗДАВИМ ФАШИСТСКУЮ ГАДИНУ». АГИТПЛАКАТ БУДЕТ ПОКАЗЫВАТЬ МУЖЕСТВО И БЕССТРАШИЕ НАШЕЙ ДОБЛЕСТНОЙ РАБОЧЕ-КРЕСТЬЯНСКОЙ КРАСНОЙ АРМИИ В ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ ПРОТИВ ФАШИСТСКОЙ МРАЗИ, САМООТВЕРЖЕННЫЙ ТРУД РАБОЧИХ, КРЕСТЬЯН И ИНТЕЛЛИГЕНЦИИ ВО СЛАВУ ВЕЛИКОЙ НАШЕЙ РОДИНЫ.

СТИХ, АГИТКА, САТИРА, НЕБОЛЬШОЙ РАССКАЗ, КАРИКАТУРА, ИЛЛЮСТРАЦИЯ—ДОЛЖНЫ РАЗИТЬ ВРАГА ТАК ЖЕ МЕТКО, КАК РАЗИТ ЕГО ПУЛЯ БОЙЦА.

ГИТЛЕР ВОРОВСКИ НАПАЛ НА СОВЕТСКИЙ СОЮЗ. ОН ХОЧЕТ ПОПРОБОВАТЬ СОВЕТСКОГО ПШЕНИЧНОГО ХЛЕБА, БЕЛОРУССКОГО САЛА, УКРАИНСКИХ ГАЛУШЕК. НУ ЧТО Ж, НАКОРМИМ ЕГО ЖЕЛЕЗОМ, СВИНЦОМ И СТАЛЬНЫМИ ГАЛУШКАМИ! СМЕРТНЫЙ ЧАС ДЛЯ ФАШИСТСКОЙ ГАДИНЫ, ДУШАЩЕЙ ДЕСЯТКИ НАРОДОВ, ПРОБИЛ. КРАСНАЯ АРМИЯ, СОВЕТСКИЙ НАРОД УНИЧТОЖАТ ЭТУ ЧЕРНУЮ ВОЛЧЬЮ СВОРУ.

СОВЕТСКАЯ СТРАНА, РУКОВОДИМАЯ ГЕНИЕМ СТАЛИНА, РАЗГРОМИТ И СОТРЕТ С ЛИЦА ЗЕМЛИ ФАШИЗМ.

Начал враг-фашист разбой.
Пусть суров и труден бой,
К бою нам не привыкать—
Мы отпор сумеем дать,
И врага с земли сметут
Наши танки и штыки;
По костям его пройдут
Красной армии полки.



Появится враг—низко, высоко ли,
Всюду сразят его гордые соколы.
Врага уничтожат, куда бы ни лез,
Гордые соколы наших небес.



Налетел фашистский сброд
На советский огород.
Как свинья бы ни скулила,
Разобьем свиное рыло!



Сегодня мы все на защиту
Любимой родины встали.
На фронте мужья и братья,—
Победа для нас ясна.
А чтобы станки на заводах
Нигде у нас не молчали,
Сестра заменяет брата,
Мужа-бойца—жена.

Да
70-годдзя
Перамогі

1945-2015



Трус, болтун и паникер—
Все они—враги народа.
Вырвем с корнем этот сор,
Эту подлую породу.
У кого длиннющ язык—
Пусть пронижет острый штык!

Да
70-годдзя
Перамогі

1945-2015

# ВАДЫ Ў РОТ НАБРАЎ

Мал. Д. Дубінскага.



— Што піша твой Карл з Усходняга фронта?

— Нічога не піша... Маўчыць, нібы ён вады ў рот набраў.

Да 70-годдзя Перамогі

1945-2015



— Сам падбіваў, сам і да рук прыбяру.

Малюнак А. ВОЛКАВА.

Да
70-годдзя
Перамогі

1945-2015




**Ф а ш ы с т:** — Пасля таго, як мой брат загінуў у Беларусі, я пакляўся, што не паеду туды. Але, відаць, так ужо суджана мне — загінуць пад Мінскам.

Малюнак Г. В А Л Ь К А.




## „ХІТРЫ“ ФРЫЦ



Фрыц адпраўляецца ў карную экспедыцыю супроць партызан з падрыхтаванай заранёй труной.

Да 70-годдзя Перамогі

1945-2015



У гаспадарцы кожны трафей спатрэбіцца.

Да 70-годдзя Перамогі

1945-2015



Летит разбойник
и бандит,
Пират воздушный—
„мессершмитт".

Но ястребком был
нашим сбит,
И вот пред нами
МУСОРшмитт!




# КАРНІКІ Ў ЛЕСЕ



— Ты бачыш партызан?
— Не, бачу я толькі магілы нашых салдат папярэдняга карнага атрада.
— Ну, то хутчэй злазь, уцякаць трэба.

Да
70-годдзя
Перамогі

1945-2015

Малюнак А. ВОЛКАВА.




Мы ад нечысці ачысцім
Землі, воды, неба сінь,
Не пабачыць псам-фашыстам,
Як цвітуць пад небам чыстым
Нашы нівы і лясы.

Янка КУПАЛА.

Да
70-годдзя
Перамогі

1945-2015




— **Дзядзя, гэта вы гэтых «тыграў» уціхамірылі?**

Малюнак Д. КРАСІЛЬНІКАВА.

Да 70-годдзя Перамогі

1945-2015

Малюнак А. ВОЛКАВА.



1944
Жыта з пустазеллем.



1945
Чыстае жыта.




Партызанскі рух на Беларусі шырыцца, карныя экспедыцыі нямецкім акупантам не дапамагаюць і яны пускаюцца на правакацыі. Гітлераўскія разбойнікі заклікаюць партызан выйсці з лясоў і зламаць зброю, за гэта яны абяцаюць партызанам поўнае памілаванне. Партызаны адказваюць на правакацыю фашыстаў яшчэ мацнейшымі ўдарамі.



— Мілыя партызаны. Мы ведаем, што вы добрыя людзі і прыяцелі, вы проста заблудзілі і выпадкова трапілі ў лес. Выйдзіце з лесу, мы вам нічога не зробім.



Партызаны пачулі голас фашысцкага „дабрадзея“ і выйшлі з лесу. І... сапраўды ён ім нічога не зрабіў.




## СУСТРЭЧА І...

**ЗАБОЙСТВА ФАШЫСЦКІХ КАТАЎ**

У БАРАНАВІЧАХ

Гітлераўская газета „Мінскер цэйтунг" паведамляе, што савецкімі партызанамі ў Баранавічах забіты гітлераўскі „галоўны камісар" горада Фрыдрых Фенч і адзін з главароў „ахоўных атрадаў".



Грымеў аркестр у гонар ката,
А побач спела ўжо расплата.

## ПРОВАДЫ



І зноў аркестр той самы грае,
Ды толькі музыка не тая.

Да 70-годдзя Перамогі

1945-2015

Партызанскі атрад „Жэлезняк" (Вілейская обласць) зрабіў паспяховы налёт на нямецкі гарнізон у вялікім насялёным пункце.

Партызаны знішчылі 210 салдат і афіцэраў ворага і разграмілі ўправы паліцыі і жандармеры. Захоплена ўзбраенне і два склады з харчаваннем.




Вясна. Выстаўляецца не першая рама.

Да 70-годдзя Перамогі

1945-2015

Мал. Красільнікава



Совецкі ключ да берлінскай брамы.

Да 70-годдзя Перамогі

1945-2015

Мал. Л. Бойка.



**Немец:** — Нарэшце мы зламалі ўпартасць гэтых беларускіх сабатажнікаў. Сягоння яны ахвотна ідуць на работу.



**Беларус:** — Такую работу мы заўсёды робім ахвотна.

Да
70-годдзя
Перамогі

1945-2015




СТАРЫ ГОД—Прымі і дабі.
НОВЫ ГОД—Будзе зроблена.

Да 70-годдзя Перамогі

1945-2015

## СТРАШНАЕ СЛОВА



— Чаму Антанеску ўцякае ад гэтай цудоўнай дамы, як чорт ад ладану?

— Ды гэтая-ж жанчына сваёю прыгожасцю запалоньвае мужчын, а яго кідае ў дрыжыкі пры адным слове палон.

## НЕБЯСПЕЧНАЯ ХВАРОБА



— На што вы скардзіцеся, хворы?

— Доктар, цяжка! У мяне зуб на зуб не трапляе. У мяне сударагі.

— Калі ў вас наступаюць гэтыя сударагі?

— Калі наступаюць рускія.



## ДОБРАБЫТ ФРЫЦА

— Як ты сябе адчуваеш, Ганс?

— «Блёхавата».

— А ты, Фрыц?

— «Парвшыва».




**Два кальцы—адзін канец**

Мал. Г. Валька.




ГІТЛЕР: — Пасля таго кальца ці не пара мне падумаць пра гэта?

Да
70-годдзя
Перамогі

1945-2015



Да 70-годдзя Перамогі

1945-2015

Мал. Гены




І Фрыц варожыць на картах:

— Як ты не кінь, дык выходзіць, што ў нашага фюрара становішча пікавае.

Да 70-годдзя Перамогі

1945-2015

# ЯК УКАРОЧВАЛІ ФРЫЦА

Мал. Г. Вальке.




Наступаў упарта, доўга —
Вось яна, нарэшце — Волга!
Глянуў фрыц на берагі,
І... паплёўся без нагі.




На Дану мы фрыца білі,—
На другую ўкарацілі.




Быў яшчэ ўкарочан тад
На Дняпры — па самы зад.




Покуль фрыц дапрэ да Шпрэ,
Дык і костак не збярэ.

Да 70-годдзя Перамогі

1945-2015

Мал. Г. Бедарава.



— Не хвалюйцеся, пан капітан, вёска намі пакінута па стратэгічных меркаваннях.

— Так, але меркавалі не вы, а партызаны.

Да
70-годдзя
Перамогі

1945-2015

# НАША ГАСЦІННАСЦЬ

Малюнкі К. ЕЛІСЕЕВА.



Мы няпрошаных гасцей...



Накормім...



Напоім...



І спаць уложым!




Малюнак Бор. ЕФІМАВА і ДАЛГАРУКАВА.




Партызанскі святочны падарунак фашыстам.

Да
70-годдзя
Перамогі

1945-2015

# ВОЖЫК



— Гадзіна раздаўлена, прымай, «Вожык», зброю!

Малюнак А. ВОЛКАВА з першага нумара «Вожыка» за 1945 г.

**Пасля перамогі людзі закасалі рукавы і ўзяліся за мірныя справы. На зямлі пачалася найвялікшая стваральная праца. Многа новых абавязкаў паўстала і перад сатырыкамі. Памочнікам сваім і паклікалі яны ляснога санітара, сябра людзей і ворага гадзюк — калючага Вожыка. Так і напісалі вялікімі літарамі на маленькім часопісе новую яго назву — «Вожык».**

**Трэба сказаць, што бацькі «Вожыка» — людзі разумныя. У той час яны забяспечылі яго добрымі іголкамі-калючкамі, што называецца кадрамі, якія ўзначальваў народны пісьменнік БССР, адзін з вядомых сатырыкаў Кандрат Кандратавіч Крапіва.**

**І па сёння, як нам здаецца, зброя часопіса не тупіцца, і ён добрасумленна выконвае свае задачы: жорстка коле не герояў нашага часу, выкрывае, бярэ за вуха ды выводзіць на сонейка ўсіх тых, хто перашкаджае працы, нашаму жыццю.**